Я. Р. Рыер,

канд. гіст. навук (Магілёў)

# АБ САЦЫЯЛЬНЫМ РАЗВІЦЦІ ВА УСХОДНЯЙ І ЦЭНТРАЛЬНАЙ ЕЎРОПЕ Ў РАННІМ СЯРЭДНЯВЕЧЧЫ

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Сярод пытанняў, якія да гэтага часу будзяць спрэчкі гісторыкаў, значнае месца займаюць тыя, што закранаюць асаблівасці грамадскага развіцця ў раннім сярэднявеччы. Перш-наперш гэта тычыцца пераходнага перыяду ад першабытнасці да класавага, феадальнага грамадства. Значныя працэсы адбываліся ў асноўным элеменце грамадства таго часу — абшчыне. Аднак гісторыя тагачаснай абшчыны вельмі слаба адлюстравана ў традыцыйных гістарычных крыніцах. Сучасны стан навукі патрабуе абапірацца на шырокі спектр сумежных гістарычных дысцыплін, праводзіць комплексныя даследаванні. Усё больш важнае значэнне набываюць даныя археалогіі. Але ўжо на дадзеным этапе намаганні даследчыкаў розных еўрапейскіх краін дазваляюць выкарыстоўваць археалагічныя матэрыялы для рашэння складаных сацыяльных пытанняў.

У апошнія часы археолагі дабіліся прыкметных поспехаў у даследаванні еўрапейскай абшчыны. Вывучэнне сістэм рассялення і забудовы паселішчаў з сярэдзіны I да пачатку II тысячагоддзя н. э. дазволілі прасачыць пераход ад сумеснага жыцця і агульнай, абшчыннай гаспадаркі да асабістага сялянскага двара з адасобленай гаспадарчай дзейнасцю. Аб гэтым сведчаць асаблівасці размяшчэння паселішчаў, іхнія памеры, адлегласць аднаго ад другога. Вялікую ролю ў інтэрпрэтацыі сацыяльнага ладу адыгрывае размяшчэнне жылых і гаспадарчых забудоў унутры паселішчаў. Інтэр'ер жытлаў дазваляе канстатаваць наяўнасць ці адсутнасць маёмаснай няроўнасці. Маюць значэнне памеры забудоў, знойдзены на паселішчах інвентар і іншыя сляды гаспадарчай дзейнасці, характар пахаванняў. Найбольш яскрава адзначаныя рысы прасочваюцца, калі іх разглядаць параўнаўчым метадам, супастаўляць розныя рэгіёны. Для нашага даследавання выбраны рэгіёны, за-

селення ўсходнімі і заходнімі славянамі, а таксама германцамі да іх рассялення на былых рымскіх землях. Выкарыстаны матэрыялы па рассяленні, тапаграфіі і забудове паселішчаў, домабудаўніцтве і інвентары, здабытыя даследчыкамі Беларусі, Украіны, Расіі, Польшчы, Чэхіі, Славакіі і Германіі[1].

**Абшчына ўсходніх славян.** Паселішча трэцяй чвэрці I тысячагоддзя звычайна складаліся з аднатыповых невялікіх жытлаў, у якіх маглі змяшчацца толькі малыя сем'і (плошча жытлаў — ад 6—9 да 20 кв. м). Але суадносіны жылых і гаспадарчых пабудоў сведчаць аб наяўнасці сумеснай гаспадаркі для ўсіх жыхароў таго ці іншага паселішча. Значыць, перад намі хутчэй за ўсё так званая земляробчая абшчына, ужо падзеленая на малыя сем'і, але з агульнай зямельнай і гаспадарчай маёмасцю. Толькі з VIII—IX стст. назіраюцца сляды паступовага стварэння абмежаваных гаспадарчых комплексаў унутры абшчыны — сялянскіх двароў. Але адзнакі сталых індывідуальных сялянскіх гаспадарак з агароджамі з'яўляюцца ў вёсках толькі з XI—XIII стст.

Такім чынам, нягледзячы на тое, што ўжо да пачатку сярэднявечча першабытная абшчына пачала распадацца, да VIII—IX стст. аб пераходзе да суседскай абшчыны гаварыць нельга. Далейшы пераход адбываўся марудна. Да XII—XIII стст. у вёсках не прыкметна і маёмаснай няроўнасці паміж сялянамі. Такія запаволеныя працэсы сацыяльнага развіцця ўплывалі і на тэмпы складання пануючых вярхоў, адлюстраванага ў стварэнні ўмацаваных рэзідэнцый знаці. Яны пачалі з'яўляцца ў VIII—IX стст., але да XI ст. іх было вельмі мала[2]. А наогул — калі адарвацца ад археалагічных фактаў — тая тэрытарыяльная, ці суседская, абшчына з захаваннем агульных правоў на зямлю, якая склалася ў XI—XII стст., заставалася ва ўсходніх славян аж да сталыпінскіх рэформ.

**Абшчына заходніх славян.** У цэлым характар сацыяльнага развіцця сялянскага насельніцтва на заходнеславянскіх землях быў амаль такі, як у ўсходніх славян. Фарміраванне суседскіх сувязей пачалося прыкладна ў VIII ст. Выдзяленне індывідуальных сялянскіх двароў-сядзіб адносіцца да XI—XII стст. Даследуючы гісторыю палабскіх славян, нямецкія вучоныя знайшлі сведчанні аб тым, што там таксама бытавое адасабленне малых сямей у асабістых жытлах наступіла значна раней, чым гаспадарчае. У Польшчы, Чэхіі і Славакіі даследаванні раннесярэднявечнай абшчыны былі больш сціплымі. Але іх вынікі не супярэчаць таму, што адзначана вышэй. Такім чынам, шлях развіцця першаснай сялянскай сацыяльнай арганізацыі ў славян лясной зоны Еўропы быў агульны.

**Абшчына германцаў.** Звернемся перш за ўсё да зямель, суседніх са славянскімі. Гэта заселенае германцамі міжрэчча



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Рэйна і Эльбы, дзе амаль не было рымскага ўплыву. Тут, як і на карэнных землях у Паўднёвай Скандынавіі, сведчаць археалагічныя даследаванні, ужо ў I—II стст. н. э. даволі яскрава акрэсліваюцца пасяленні, падзеленыя на сядзібы. Ёсць сведчанні і аб існаванні на паўночнагерманскім узбярэжжы і ў Ютландыі нават у канцы I тысячагоддзя да н. э. агароджаных палёў[3]. Пазней, у VII—IX стст., такія сядзібы, плошчай да 1 га, часта за парканам, добра вядомы. Больш таго, на некаторых паселішчах узбярэжжа Паўночнага мора ўжо з пачатку новай эры адзначаны элементы сацыяльнай дыферэнцыяцыі. І хаця ў Паўднёвай Германіі знаходкі не такія бясспрэчныя, можна канстатаваць, што ў германскіх землях ужо ў першай палове I тысячагоддзя н. э. складвалася своеасаблівая суседская абшчына са значнымі правамі сялянскіх сямей на зямлю, магчыма, з адсутнасцю перадзелаў. І менавіта на гэтай аснове ў V—VII стст. фарміравалася асабістая ўласнасць на зямлю — тое, што ў франкаў па "Салічаскай Праўдзе" называлася алодам. Афармленне алода, як вядома, значна паскорыла сацыяльную дыферэнцыяцыю грамадства. Таму ў VIII ст. пачалося даволі інтэнсіўнае аслабленне абшчыны і, адпаведна, афармленне землеўладальніцкай знаці, што добра адлюстравана шпаркім знікненнем з VII ст. абшчынных умацаваных цэнтраў (так званых фольксбургаў) і будаўніцтвам з таго ж часу рэзідэнцый знаці, якая ў IX ст. паставіла пад свой кантроль усе землі.

Такім чынам, шлях развіцця сярэднявечнай германскай абшчыны і наогул грамадства быў іншым, чым у іх усходніх суседзяў. Чаму? Археалагічныя матэрыялы даюць наступныя адказы. Гаспадарчае развіццё германскай і славянскай вёскі на працягу ўсяго I тысячагоддзя знаходзілася, у прынцыпе, на аднолькавым узроўні[4]. Але значныя адрозненні наглядаюцца ў размяшчэнні паселішчаў, асабліва ў дынаміцы засялення і асваення зямлі. Больш кантынентальны клімат на ўсходзе, радзейшае насельніцтва ў славян, акрамя некаторых спрыяльных мясцін, патрабавалі менавіта калектыўнай працы і такіх жа форм землеўладання. Гэта ж, але абапіраючыся на пісьмовыя крыніцы, сцвярджае Л. В. Мілаў аб усходнеславянскай абшчыне[5]. Вышэй адзначалася, што і заходнеславянская абшчына развівалася так жа. Толькі пасля складання заходнеславянскіх дзяржаў, пад уплывам заходніх зямельных парадкаў, пануючыя вярхі пачалі спрыяць фарміраванню асабістай зямельнай уласнасці. Але павольнае развіццё феадальнай уласнасці і феадальных адносін у цэлым, позняе ўзнікненне асабістаўласніцкіх правоў на зямлю ў заходніх славян і адсутнасць такіх правоў у старажытнарускай вёсцы замарудзілі грамадскую эвалюцыю.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Адносна ранняе выдзяленне сялянскіх двароў-сядзіб у германцаў, відаць, таксама было звязана з геаграфічным фактарам — наяўнасцю невялікіх анклаваў прыдатнай зямлі ў Скандынавіі і Паўночнай Германіі. Магчыма, сказаўся і рымскі ўплыў. Усё гэта стварыла спрыяльныя ўмовы для складання і ўмацавання пастаянных адасобленых сялянскіх надзелаў, якія, паводле пісьмовых крыніц, ператварыліся ў алоды.

Археалагічныя даследаванні дазваляюць убачыць працэсы, не адлюстраваныя ў іншых крыніцах. Безумоўна, формы ўласнасці археалагічныя факты не раскрываюць. Але аснову для гістарычных абагульненняў даюць. Застаецца меркаваць, што сумесныя намаганні гісторыкаў і археолагаў дапамогуць лепш разабрацца ў тым, чаму на пачатку складання класавага грамадства, пачаўшы з аднаго ўзроўню, "варварская" Еўропа падзялілася на Захад і Усход не толькі ў геаграфічным, але і ў сацыяльным сэнсе, што добра бачна і сёння.

[1] *Тимощук Б. А.* Восточнославянская община VI—X вв. н. э. М., 1990; *Буров В. А.* Жаровский конец Жабенской волости в VIII—XVI вв. по историко-археологическим данным //Памятники железного века и средневековья на Верхней Волге и Верхнем Подвинье. Калинин, 1989; *Podwińska Z.* Zmiany form osadnictwa wiejskiego na ziemiach polskich we wczesnejszym średniowieczu. Wrocław; Warszawa; Gdańsk, 1971; *Lodowski J.* Dolny Sląsk na początku średniowiecza (VI—X ww.). Wrocław, 1980; *Pitterová A.* Typy nejstaršich siovanských sidlišt vesnického charakteru a jejich vývoj ve světle archeologických pramenů //Česky Lid. 1968. R. 55. Z. 2—3; *Měřinsky Z.* Studium dejin osidleni na Moravě a ve Slezsku //Archeologia historica. Brno, 1982. N 7; *Donat P.* Haus, Hof und Dorf in Mitteleuropa vom 7. bis 12. Jahrhundert. Berlin, 1980; *Herrmann J.* Siedlung, Wirtschaft und geselschaftliche Verhältnisse der slawischen Stämme zwichem Oder/Neisse und Elbe. Berlin, 1968; *Haarnagel W.* Die Grabung Feddersen Wierde. Methode, Hausbau, Siedlungs- und Wirtschaftsformen sowie Sozialstruktur. Wiesbaden, 1979; *Steuer H.* Frühgeschichtliche Sozialstrukturen in Mitteleuropa //Abhandlungen Akademie Wissenschaften. Göttingen, 1982. Bd. 3. N 128; *Winkelmann W.* Ausgrabungen in der frühmittelalterlichen Siedlung bei Warendorf //Neue Ausgrabungen in Deutschland. Berlin, 1958.

[2] Древняя Русь. Город, замок, село // Археология СССР. М., 1985. С. 39—51.

[3] История крестьянства в Европе: Эпоха феодализма. М., 1985. Т. 1. С. 97—98.

[4] *Рыер Я. Р.* Развіццё сярэдневяковай вёскі на тэрыторыі Беларусі і ў суседніх землях. Магілёў, 1990. *Podwińska Z.* Op. cit. S. 707—708; *Herrmann J.* Op. cit.; *Bentzien U.* Bauernarbeit im Feudalismus. Berlin, 1980.

[5] *Милов Л. В.* Общее и особенное российского феодализма //История СССР. 1989. № 2. С. 39—68.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова